**11 клас**
**Комплексная работа**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Лічбы запішыце словамі.**

*Максімальная колькасць балаў — 7*

По численности населения Беларусь занимает пятое место среди стран СНГ, 17 место — в Европе и 89 в мире. На 1 января 2014 года численность жителей в Республике Беларусь — около 9,5 млн., плотность населения составляет 46 жителей на один квадратный километр. Среди регионов наименее плотно населенной является Витебская область — тридцать человек на один квадратный километр. В Минске этот показатель превысил 5,5 тысячи человек на квадратный километр.

По данным переписи населения 2009 года, на территории Беларуси проживали более 130 национальностей. Среди них – белорусы 83,7 %.

______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________
______________________________________________________________________________

**Заданне 2. Устанавіце, якое значэнне мае слова *дом* у прыведзеных кантэкстах з твораў Якуба Коласа. Запішыце гэтыя значэнні.**

*Максімальная колькасць балаў — 4*

1. Ўгары, высока над *дамамі*, / Пазалачонымі крыжамі / Блішчалі цэрквы і касцёлы, / Узняўшысь к небу галавамі, / На сонцы зззяючы вярхамі.

2. У хаце вучням не сядзіцца – / Прайшла ахвота ў іх вучыцца; / І сам дарэктар уздыхае, / На Мікалаўшчыну ківае, / У смутку нейкім часта ходзіць. / Аб *доме* гутарку заводзіць.

3. І там мы будзем жыць таксама: / Няма ўжо горшай, як тут, яма. / А сенакос тут дзе? – за светам! / А там блізютка, каля *дома* – / Парэчча добра мне знаёма.

4. Ў садок зайшоў і пчол паслухаў, / А ў сенях стаў сабаку перыць, / Што ўночы кепска дом пільнуе, / Што мала брэша, кепска чуе, / Зайцоў не гоніць і не ловіць, / А толькі знае і наровіць, / Каб як у хату зачасацца.

**АДКАЗ:**

1. ____________________________________________________________
2. ____________________________________________________________
3. ____________________________________________________________
4. ____________________________________________________________

**Заданне 3. Запішыце, колькі зычных гукаў у словах кожнага слупка.**

*Максімальная колькасць балаў – 6*

***АДКАЗ: Усяго мяккіх___ глухіх____ шыпячых____***

| | | |
|---|---|---|
| раз'юшаны | бяздараж | прыязджаць |
| счарсцвелы | адказчык | нарэшце |
| скірда | жаніцьба | пагрузчык |

**Заданне 4. Замяніце ў сказе па адным слове, каб сказы атрымаліся лагічна правільнымі. Адказ запішыце ў табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў — 4*

| № сказа | Слова, **якое** трэба замяніць | Слова, **якім** трэба замяніць |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |

1. Пацеркі ў царкве святар прамаўляў сёння з вялікім імпэтам.
2. Дыктанты ў школьным навучанні прызначаны для таго, каб праверыць пісьменства вучняў.
3. Ён сам расказваў у класе, што вы яму зрабілі ў прыбудоўцы лабараторыю, што вы яму прыносілі з фабрыкі драўляны вугаль і саляную кіслату для вопытаў.
4. Раней бульбу мачалі ў селядцовы расол — лёх.

**Заданне 5. Запішыце ў пустыя клеткі па адным назоўніку агульнага роду, які ўтвораны пры дапамозе суфікса, змешчанага злева**.

*Максімальная колькасць балаў — 4*

| **№** | **Суфікс** | **Слова** |
|---|---|---|
| 1. | -ох-(а) / **або** -ёх-(а) | |
| 2. | -ынк-(а) / **або** -інк-(а) | |
| 3. | -ыл-(а) / **або** -іл-(а) | |
| 4. | -ош-(а) | |

**Заданне 6. Укажыце сінтаксічную функцыю выдзеленых слоў (падкрэсліце адпаведна)**

*Максімальная колькасць балаў — 5*

1. Жыццё **пражыць** – не поле перайсці.
2. Надышла пара **вяртацца** ў горад.
3. Я лёг **спаць.**
4. Камандзір загадаў яму **збірацца** заўтра ў лес.
5. Хто **ўмее трымаць язык за зубамі**?

**Заданне 7. Як вядома, беларуская п'еса развівалася ў XVIII–XIX стст. на аснове інтэрмедый, дзе героі гаварылі на розных мовах і часам не разумелі адзін аднаго. Так ствараўся камічны эфект. Запішыце, на якіх мовах гаварылі наступныя персанажы.**

*Максімальная колькасць балаў — 4*

Кожная дзейная асоба размаўляла на мове, адпаведнай свайму сацыяльнаму паходжанню: сяляне, прадстаўнікі гарадскіх нізоў — на ______ ______________________________
ксёндз, студэнт — ________________________,
шляхціц — ___________________________________,
цыган, яўрэй — ________________________________________.

**Заданне 8. Вызначце па азначэнні сродкі мастацкай выразнасці мовы**

*Максімальная колькасць балаў — 4*

1) Моцнае змяншэнне з’явы або яе адзнакі, якасці –
2) Невялікі верш хвалебнага зместу, верш-камплімент –
3) Жанр урачыстай лірычнай паэзіі, твор, у якім услаўляецца выдатная падзея або асоба –
4) Зварот, які ўжываецца замест назвы ці ўласнага імя і ўказвае на якую-небудзь важную асаблівасць з’явы, прадмета або рысу чалавека –
5) Лірычны верш, прасякнуты сумным настроем –
6) Сінтаксічна фігура, пропуск аднаго з членаў сказа, звычайна выказніка, з мэтай надаць выказванню большую дынамічнасць, энергію –
7) Від верша, які не прытрымліваецца якой-небудзь строгай заканамернасці ў сваёй рытмічнай структуры; як правіла, не мае і рыфмы –
8) Эмацыянальны ўздым, страсць, якімі прасякнуты мастацкі твор і якія вызначаюць яго ідэйную скіраванасць –

**Заданне 9. Вызначце творы, пра якія ідзе гаворка, іх аўтараў і жанр:**

*Максімальная колькасць балаў — 6*

**А)** Тэма вернасці роднай зямлі, служэння інтэлігенцыі народу. Вобраз Архіпа – вясковага інтэлігента з абуджаным сумленнем, пачуццём абавязку перад людзьмі, які імкнецца пазнаць жыццё, знайсці “першапрычыну ўсякае істоты”. Жыццёвая мудрасць дзеда Яхіма, яго запавет маладому пакаленню.

**Б)** Выдатны твор беларускай літаратуры эпохі Адраджэння на лацінскай мове. Увасабленне рэнесансавых ідэй у вобразе Вітаўта. Сімвалічнае значэнне цэнтральнага вобраза і сцэн велікакняскага палявання. Гуманізм, агульначалавечыя каштоўнасці ў аснове твора.

**АДКАЗ:)**

**А)**____________________________________________________________

**Б)**____________________________________________________________

**Заданне 10. Устаўце прапушчаныя словы. Запішыце назву твора і сапраўднае імя яго аўтара.**

*Максімальная колькасць балаў — 6*

Вобразы мілыя роднага краю,
____________ і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я

К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя ______________ красы?

Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,
___________ мілай красой.

Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гул шчаслівы,
Песня ___________ дубоў...

Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песьні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

**АДКАЗ:**
**назва твора**____________________________________________________

**сапраўднае імя аўтара**____________________________________________

**Комплексная работа**
**11 клас**

**ДАВЕДКІ**

| *Заданні* | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | ***Усяго*** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **7** | **4** | **6** | **4** | **4** | **5** | **4** | **4** | **6** | **6** | **50** |

**Заданне 1.**
***Каментарый. За 1 лічэбнік (пераклад, правапіс) – 0,5 бала, плюс 2 балы – за астатні пераклад.***

По колькасці насельніцтва Беларусь займае пятае месца сярод краін СНД, **сямнаццатае** месца — у Еўропе і **восемдзесят дзявятае** ў свеце. На **першага** студзеня **дзве тысячы чатырнаццатага** года колькасць жыхароў у Рэспубліцы Беларусь — каля **дзевяці з паловай мільёнаў**, шчыльнасць насельніцтва складае **сорак шэсць** жыхароў на адзін квадратны кіламетр. Сярод рэгіёнаў найменш шчыльна населенай з'яўляецца Віцебская вобласць — трыццаць чалавек на адзін квадратны кіламетр. У Мінску гэты паказчык перавысіў **пяць цэлых пяць дзясятых** тысячы чалавек на квадратны кіламетр.

Паводле даных перапісу насельніцтва **дзве тысячы дзявятага** года, на тэрыторыі Беларусі пражывалі больш за **сто трыццаць** нацыянальнасцей(яў). Сярод іх беларусы – **восемдзесят тры цэлыя сем дзясятых** працэнта.

**Заданне 2.**

1. Будынак для жылля.
2. Сям'я.
3. Сялянскі двор, сядзіба.
4. Гаспадарка, розная сялянская маёмасць.

**Заданне 3.** ***Каментарый. Адзін слупок – 2 балы.***

***АДКАЗ: Усяго мяккіх 6 глухіх 6 шыпячых 4***

| | | |
|---|---|---|
| раз'юшаны 2 | бездараж 1 | прыязджаць 2 |
| счарсцвелы 3 | адказчык 5 | нарэшце 0 |
| скірда 1 | жаніцьба 0 | пагрузчык 2 |

**Заданне 4.**

| **№ сказа** | **Слова, якое трэба замяніць** | **Слова, якое трэба ўставіць** |
|---|---|---|
| 1. | пацеркі | пацеры |
| 2. | пісьменства | пісьме́ннасць |
| 3. | драўляны | драўнінны |
| 4. | лёх | лёк |

**Заданне 5.**

***УВАГА! У вучняў – свае прыклады слоў.***

| **№** | **Суфікс** | **Слова (прыклады)** |
|---|---|---|
| 1. | -ох-(а) / -ёх-(а) | чысцёха |
| 2. | -ынк-(а) / -інк-(а) | сірацінка |
| 3. | -ыл-(а) / -іл-(а) | дурыла |
| 4. | -ош-(а) | святоша |

**Заданне 6.Сінтаксічная роля выдзеленых слоў.**

1. Жыццё **пражыць** – не поле перайсці. (дзейнік)
2. Надышла пара **вяртацца** ў горад. (азначэнне)
3. Я лёг **спаць.** (акалічнасць)
4. Камандзір загадаў яму **збірацца** заўтра ў лес. (дапаўненне)
5. Хто **ўмее трымаць язык за зубамі**? (выказнік)

**Заданне 7.**

Кожная дзейная асоба размаўляла на мове, адпаведнай свайму сацыяльнаму паходжанню:
сяляне, прадстаўнікі гарадскіх нізоў — ***па-беларуску,***
ксёндз, студэнт — ***на латыні,***
шляхціц — ***па-польску,***
цыган, яўрэй — ***на змешанай (беларуска-польскай трасянцы)***.

**Заданне 8.**

1) Моцнае змяншэнне з'явы або яе адзнакі, якасці – **літота.**
2) Невялікі верш хвалебнага зместу, верш-камплімент – **мадрыгал.**
3) Жанр урачыстай лірычнай паэзіі, твор, у якім услаўляецца выдатная падзея або асоба–**кантата, ода.**
4) Зварот, які ўжываецца замест назвы ці ўласнага імя і ўказвае на якую-небудзь важную асаблівасць з'явы, прадмета або рысу чалавека – **перыфраза.**
5) Лірычны верш, прасякнуты сумным настроем – **элегія.**
6) Сінтаксічна фігура, пропуск аднаго з членаў сказа, звычайна выказніка, з мэтай надаць выказванню большую дынамічнасць, энергію – **эліпсіс.**
7) Від верша, які не прытрымліваецца якой-небудзь строгай заканамернасці ў сваёй рытмічнай структуры; як правіла, не мае і рыфмы – **верлібр, (белы, свабодны верш).**
8) Эмацыянальны ўздым, страсць, якімі прасякнуты мастацкі твор і якія вызначаюць яго ідэйную скіраванасць – **пафас.**

**Заданне 9.**

А) "Роднае карэнне", Максім Гарэцкі, апавяданне.

Б) "Песня пра зубра", Мікола Гусоўскі, паэма.

**Заданне 10.**

Смутак, смутнай (сумнай), Ззяючы, магутных.

"Родныя вобразы", Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.